ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт

№ 5 (887) | Аўторак, 21 сакавіка 1995г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## У СКЛАДЗЕ АКРУГОВЫХ ВЫБАРЧЫХ КАМІСІЙ

14 мая бягучага года адбудуцца выбары дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 13-га склікання, 11 чэрвеня -- у мясцовыя Саветы. Гэта вельмі важная палітычная кампанія. Ад вынікаў яе правядзення ў многім будзе залежыць наша далейшае жыццё.

Абласны выканаўчы камітэт разгледзеў пратаколы палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў, працоўных калектываў, сходаў выбаршчыкаў па месцы жыхарства і ваеннаслужачых, а таксама заявы выбаршчыкаў па вылучэнню прадстаўнікоў у акруговыя выбарчыя камісіі па выбарах дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь і на падставе артыкула 22 Закона РБ "Аб выбарах дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь" утварыў выбарчыя акругі па Гомельскай вобласці.

Шляхам падачы заяў ад выбаршчыкаў у склад Гомельскай-Савецкай выбарчай акругі №82 увайшоў студэнт 5 курса філалагічнага факультэта нашага універсітэта Сяргей Уладзіміравіч Вінаградаў, у склад выбарчай камісіі Гомельскай-Прамысловай выбарчай акругі №84 -- дацэнт кафедры тэарэтычнай фізікі Віктар Васільевіч Андрэеў.

◆◆◆

На канферэнцыі выбаршчыкаў нашага універсітэта ў гарадскую акруговую выбарчую камісію па выбарах у мясцовыя Саветы выбраны загадчык кафедры фізічнага выхавання дацэнт Віктар Антонавіч Каляда.

## ЗАСЛУЖЫЎ ПРЫЗНАННЕ

З 27 лютага па 3 сакавіка ў польскім горадзе Вісле праходзіла 24-я зімовая міжнародная школа па малекулярнай і квантавай акустыцы. Ад Рэспублікі Беларусь у яе рабоце прыняў удзел вядучы спецыяліст, кіраўнік лабараторыі фотаакустычнай спектраскапіі кандыдат фізіка-матэматычных навук Г.С.Міцюрыч. Ён выступіў з дакладам "Даследаванне магнітных вадкасцей метадам фотадэфлекцыйнай спектраскапіі", які выклікаў вялікую цікавасць вучоных. Не выпадкова яго запрасілі ўжо ў бягучым навучальным годзе ў Сілезскі тэхнічны універсітэт для чытання цыкла лекцый па фотадэфлекцыйнай спектраскапіі.

У час знаходжання за мяжой Г.С.Міцюрыч сумесна з вучонымі Інстытута фундаментальных праблем тэхнікі Польскай Акадэміі навук выконваў работы па вывучэнню ўласцівасцей гіратропных асяроддзяў магнітных вадкасцей фотатэрмаакустычнымі метадамі.

## З НАГОДЫ ЮБІЛЕЮ

У пачатку сакавіка адзначыў сваё 20-годдзе санаторый-прафілакторый ГДУ. Павіншаваць са знамянальнай падзеяй калектыў - юбіляр, які клапоціцца аб нашым здароўі, прыйшлі ў гэтую лячэбна-прафілактычную ўстанову рэктар універсітэта член-карэспандэнт АН Беларусі Л.А.Шамяткоў, першы прарэктар прафесар М.В.Селькін, прарэктар па вучэбнай рабоце М.М.Воінаў, старшыні прафкомаў Г.І.Варатніцкі, Н.І.Колтышава, галоўны бухгалтар І.А.Курава, старшыня абкома прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі У.Я.Курылаў, намеснік старшыні абласнога фонда "Здароўе" С.У.Бандарэнка.

Шмат цёплых, сардэчных слоў удзячнасці прагучала ў адрас урачоў і мядсясцёр, абслугоўваючага персаналу, работніц сталовай, якія і лячэбнымі працэдурамі, і добрым харчаваннем, і ўважлівымі, клапатлівымі адносінамі да кожнага, хто нябывае пуцёўкі ва універсітэцкую здраўніцу, умацоўваюць стан здароўя студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў нашага універсітэта.



Калектыў санаторыя-прафілакторыя за плённую работу ў справе аздараўлення ўзнагароджаны Ганаровай граматай абкома галіновага прафсаюза, заахвочаны многімі каштоўнымі прызамі.

За вялікі ўклад у аздараўленне студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта ганаровымі граматамі рэктарата і прафкома, якія ўручыў Л.А.Шамяткоў, узнагароджаны галоўны ўрач санаторыя-прафілакторыя С.А.Залатых, повар В.М.Грамыка, ст. медсястра Т.Р.Струкава, рабочая сталовай Л.П.Нечыталюк. Леанід Аляксандравіч уручыў таксама работнікам санаторыя-прафілакторыя грашовыя прэміі.

**Т.НІКАЛАЕВА.**

**На здымку: каштоўны сувенір ад прафкома студэнтаў галоўнаму ўрачу С.А.Залатых уручае яго старшыня Н.І.Колтышава.**

**Фота У.Чысціка.**

**СЁННЯ Ў НУМАРЫ:**

◆ 1 Выбары -- важная палітычная кампанія.

◆ 2 Алімпіяды па інфарматыцы і юбілей спявачкі.

◆ 3-4-5-6-7 Для вас,абітурыенты - 95. Як падрыхтавацца да ўступных экзаменаў.

◆ 8 Паспяховыя старты бегуноў. Кулінарны конкурс сярод мужчын.

ЮБІЛЕЙ СПЯВАЧКІ

# УДЗЯЧНАСЦЬ І МОРА КВЕТАК



Аматарам песні добра вядома імя салісткі народнага ансамбля "Заранка" Тамары Рыгораўны Макушынскай. Яна -- выканаўца народных і шматлікіх сучасных папулярных песень. Хто прысутнічаў на яе канцэртах, не мог не зачаравацца цудоўным голасам спявачкі, яе асабістай прыгажосцю і душэўнай пяшчотай. Тамара Рыгораўна пачынала з прафесійнай сцэны, але потым вырашыла стаць выкладчыцай замежнай мовы, а спевы сталі для яе як бы другой прафесіяй -- грамадскай. Яна выступала з канцэртамі ў многіх гарадах нашай рэспублікі і шматлікіх краінах замежжа.

Ужо 20 гадоў як Тамара Рыгораўна сваім голасам зачароўвае слухачоў самага рознага ўзросту. З нагоды гэтага юбілею напярэдадні Дня жанчын -- 6 сакавіка -- упраўленне адукацыі Гомельскага аблвыканкома і абласны Дом тэхнічнай і мастацкай творчасці арганізавалі яе творчы вечар, які адбыўся ў актавай зале нашага універсітэта. Прысутныя з задавальненнем пазнаёміліся з творчай дзейнасцю юбіляркі, старшай выкладчыцы кафедры нямецкай і французскай моў ГДУ, з захапленнем слухалі яе песні, за кожную з якіх дзякавалі салістцы дружнымі працяглымі апладысментамі, букетамі яркіх вясновых кветак.

На творчым вечары Тамары Рыгораўне было выказана шмат цёплых віншавальных слоў, уручаны памятныя падарункі ад розных арганізацый і сяброў.

# ХТО ПАТРЭБЕН КАМП'ЮТЭРУ

Камп'ютэру патрэбен гаспадар... Камп'ютэру патрэбен карыстальнік... Але каб як гаспадару і карыстальніку быў патрэбен камп"ютэр, неабходна адлаведнае праграмнае забеспячэнне. Без праграм камп'ютэр -- гэта "груда жалеза". Перш за ўсё неабходна аперацыйная сістэма, якая кіруе рэсурсамі камп'ютэра -- памяццю, працэсарам і перыферыйнымі ўстройствамі, а таксама прыкладныя праграмы для рашэння канкрэтных праграм. Паколькі сфера ўжывання камп'ютэраў пастаянна пашыраецца, то патрабуецца ўсё ўзрастаючая колькасць праграм. Пры гэтым, калі для стварэння апаратнай часткі камп'ютэра практычна не патрабуецца пашырэння існуючай вытворчасці /з-за поўнай аўтаматызацыі тэхналагічнага працэсу/, стварэнне новага праграмнага прадукта патрабуе індывідуальнай работы аднаго, а ў апошні час і груп праграмістаў.

Такім чынам, камп'ютэру спачатку патрэбен праграміст, прычым з кожным годам патрабуецца ўсё большая колькасць праграмістаў /такая сусветная тэндэнцыя/. 10 гадоў назад у былым Савецкім Саюзе пачаўся працэс "камп'ютэрнага ўсенавуча" -- у школах, тэхнікумах, ВНУ... Пачаўся ён своеасабліва -- практычна пры поўнай адсутнасці камп'ютэраў. Да сённяшняга часу сітуацыя некалькі змянілася -- практычна ва ўсіх навучальных установах ёсць класы камп'ютэрнай тэхнікі / праўда, характарыстыкі многіх не вытрымліваюць ніякай крытыкі/, падрыхтаваны кадры выкладчыкаў і неабходныя вучэбныя дапаможнікі.

Усе гэтыя гады абласное ўпраўленне адукацыі праводзіць школьныя алімпіяды па інфарматыцы /гарадскія, раённыя, абласныя/, у якіх прымаюць удзел лепшыя праграмісты сярэдніх школ, ВВК, ліцэяў і іншых адукацыйных цэнтраў. Пераможцы алімпіяд мінулых гадоў складаюць аснову прафесіяналаў вышэйшай кваліфікацыі ў галіне праграміравання, камп'ютэрнай тэхнікі і матэматычнага мадэлявання Рэспублікі Беларусь.

Па традыцыі сёлета абласное ўпраўленне адукацыі сумесна з нашым універсітэтам і Інстытутам ўдасканалення настаўнікаў праводзіла абласную алімпіяду ў час зімовых канікулаў. У ёй прынялі ўдзел звыш 80-ці вучняў 10-х, 11-х класаў і так званых "пілотных школ" /навучанне праграміраванню па тэхналогіі ЗША/, якія прадстаўлялі ўсе раёны вобласці. Таксама па традыцыі ўсе іншагароднія ўдзельнікі размяшчаліся ў гасцінных сценах вышэйшага тэхнічнага вучылішча № 81 /дырэктар А.Н.Пузырын/. Алімпіяда праводзілася ў два туры, абодва -- практычныя. У кожным туры ўдзельнікам прапаноўвалася рашыць дзве задачы, правільнасць рашэння вызначалася па выніках тэставых разлікаў /што выключае які-небудзь суб'ектывізм/. Пераможцамі прызнаны: Ігар Ермалаеў /11 клас, ліцэй №1 г.Гомеля, настаўнік Г.А.Савідава), Андрэй Лагвіненка (10 клас, СШ №51 г.Гомеля, настаўнік І.А.Швадронава/, "пілотныя школы" -- Дзмітрый Швядоўскі /СШ №5 г.Мазыра, настаўнік А.В.Швядоўскі/.

Аргкамітэт алімпіяды выказвае падзяку спонсарам, якія падтрымалі яе ўдзельнікаў. Галоўны прыз -- вучэбную іграву прыстаўку "Ратон" -- устанавіла НВА "Ратон" /генеральны дырэктар С.С.Сідорскі/.

Іншыя прызы -- калькулятары -- прадставіла Гомельскае канструктарскае бюро сістэмнага праграміравання /нач. Ю.А.Гаўрылаў/.

Па выніках абласной алімпіяды сфарміраваны дзве каманды для ўдзелу ў рэспубліканскай алімпіядзе, якую ў канцы бягучага месяца будзе праводзіць Гомельскае абласное ўпраўленне адукацыі сумесна з нашым універсітэтам і Інстытутам удасканалення настаўнікаў. Наш горад мае багатыя традыцыі ў сферы праграміравання і камп'ютэрнай тэхнікі і таму аргкамітэт Рэспубліканскай алімпіяды спадзяецца на падтрымку тых, хто на справе ўносіць уклад у інтэлектуальную будучыню нацыі.

**У.АРЛОЎ,**
**старшыня журы абласной і Рэспубліканскай алімпіяд па інфарматыцы, дэкан матэматычнага факультэта.**

З УЗНАГАРОДАЙ!

*За шматгадовую плённую навуковую і вучэбную работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці дацэнт кафедры філасофіі КУКСА Васіль Фёдаравіч узнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.*



Абітурыентам-95

# АБ ТЫМ, ЯК ПАСПЯХОВА ВЫТРЫМАЦЬ УСТУПНЫЯ ЭКЗАМЕНЫ

***Пераважная большасць абітурыентаў паступае ў наш універсітэт з добрымі і выдатнымі адзнакамі ў атэстатах сталасці. Аднак гэта яшчэ не гарантуе поспеху. Многія выпускнікі школ і іншых навучальных устаноў не могуць пацвердзіць свае веды на прыёмных экзаменах. Змяшчаемыя ў сённяшнім нумары нашай газеты рэкамендацыі старшынь прадметных камісій у пэўнай ступені дапамогуць лепшай арыентацыі абітурыентаў у час здачы экзаменаў пры паступленні ў ГДУ.***

***Неабходныя кансультацыі можна таксама атрымаць на адпаведных кафедрах факультэтаў і напярэдадні ўступных экзаменаў.***

## ФІЗІКА

Сёлета, як і ў папярэднія гады, уступны экзамен па фізіцы ў Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны праводзіцца ў вуснай форме. Мэта экзамену -- выявіць якасць ведаў і наяўнасць практычных навыкаў іх выкарыстання пры рашэнні канкрэтных задач. Абітурыенту, які рыхтуецца да экзамену па фізіцы, ды і па іншых вусных дысцыплінах, карысна азнаёміцца з наступнымі правіламі і асаблівасцямі правядзення вуснага экзамену:

1. Пачатак экзамену ў 8 гадзін 20 мінут. Дзень правядзення экзамену і нумар аўдыторыі ўказаны ў раскладзе экзаменаў.

2. Абітурыенты заходзяць у аўдыторыю для здачы экзамену ў парадку чаргі, якую ўстанаўліваюць самі.

3. Абітурыент, які з"явіўся на экзамен, павінен прадаставіць экзаменатарам свой экзаменацыйны ліст і дакумент, які засведчвае асобу (пашпарт). Толькі пасля гэтага абітурыент бярэ экзаменацыйны ліст і атрымлівае ў экзаменатара лісты-укладышы для падрыхтоўкі да адказу. Час падрыхтоўкі -- 40 мінут.

4. Заняўшы месца, указанае экзаменатарам, абітурыент абавязаны на кожным лісце-укладышу ўказаць дату правядзення экзамену, нумар экзаменацыйнага білета, нумар экзаменацыйнага ліста, прозвішча, імя і імя па бацьку поўнасцю.

5. Экзаменацыйны білет змяшчае два тэарэтычныя пытанні і ўмовы задачы, якую неабходна рашыць. Пытанні і задачы ў білеце падбіраюцца такім чынам, каб ахапіць розныя раздзелы курса фізікі. Рэдакцыя пытанняў, змешчаных у білеце, паўтарае іх рэдакцыю ў праграме для паступаючых у ВНУ.

6. Адказы на тэарэтычныя пытанні білета абітурыент абавязаны даць у пісьмовай форме на лістах-укладышах на беларускай або рускай мове. У адказе павінны змяшчацца фармуліроўкі азначэнняў фізічных велічынь і фізічных законаў, формулы і іх вывады, графікі, якія ілюструюць абмяркоўваемую фізічную з"яву, і схемы эксперыментаў, калі яны неабходны.

7. Прапанаваная ў білеце задача адносіцца да аднаго з раздзелаў курса фізікі, вызначаных на падставе праграмы па фізіцы для паступаючых у ВНУ і не выходзіць за рамкі патрабаванняў гэтай праграмы. Умоўны пералік раздзелаў праграмы наступны:

*Кінематыка. Асновы дынамікі. Законы захавання ў механіцы.*

*Элементы статыкі. Вадкасці і газы.*

*Асновы малекулярна-кінетычнай тэорыі. Газавыя законы.*

*Цеплавыя з'явы.*

*Электрастатыка.*

*Законы пастаяннага току.*

*Магнітнае поле. Электрамагнітная індукцыя.*

*Хістанні і хвалі.*

*Оптыка.*

*Квантавая фізіка.*

8. Абітурыент рашае задачу на лістах-укладышах, выкарыстоўваючы іх у якасці чарнавіка. Рошаная задача павінна быць перапісана на чысты ліст, змяшчаць кароткія ўмовы, поўнае рашэнне, аналітычны і лічбавы адказы. Для рашэння задач карыстацца толькі адзінкамі сістэмы СІ.

9. Абітурыенту не дазваляецца карыстацца даведнікамі, табліцамі, мікракалькулятарамі і г.д., а таксама прыносіць з сабою чыстыя лісты паперы. Усе неабходныя для рашэння задачы лічбавыя значэнні змешчаны ў яе ўмове.

10. Работа на лістах-укладышах выконваецца шарыкавай або пер"явой ручкай. Колер пасты або чарнілаў -- сіні або чорны.

11. Выходзіць з аўдыторыі ў час правядзення экзамену забараняецца.

12. У выпадку нязгоды абітурыента з адзнакай, у адпаведнасці з правіламі прыёму ўступных экзаменаў у ВНУ, у дзень аб"яўлення адзнакі ён можа падаць апеляцыю ў прыёмную камісію. На апеляцыйнай камісіі ў прысутнасці абітурыента яго работа разглядаецца яшчэ раз. Ніякія дадатковыя тлумачэнні да запісаных адказаў на пытанні і рашэнні задачы апеляцыйнай камісіяй не прымаюцца.

13. Пры няяўцы абітурыента на экзамен па ўважлівай прычыне пытанне аб яго допуску да здачы экзамену ў другі дзень рашаецца прыёмнай камісіяй ГДУ.

## ГЕАГРАФІЯ

Сёлета ў нашым універсітэце ў чарговы раз адбудзецца набор студэнтаў, якія будуць вучыцца па спецыяльнасцях "геаграфія", "геаграфія і англійская мова", "геаграфія і нямецкая мова". Вопыт працы прыёмнай камісіі ў мінулыя гады дазваляе зрабіць пэўныя высновы аб узроўні падрыхтоўкі абітурыентаў па гэтым прадмеце. Многім здаецца, што геаграфія -- гэта не матэматыка, фізіка альбо хімія, і таму ў яе вывучэнні няма складанасцей і яны яе добра ведаюць. Аднак на самой справе гэта далёка не так, аб чым сведчаць вынікі ўступных іспытаў у мінулым годзе. Аказваецца, не такая яна ўжо і простая -- геаграфія. Так, у мінулым годзе з 58 абітурыентаў, якія мелі ў атэстатах выдатныя адзнакі, на іспытах іх пацвердзілі 22 чалавекі, 20 атрымалі "добра", 13 -- "здавальняюча" і 3 абітурыенты праваліліся. Пры гэтым аналіз вынікаў уступных іспытаў паказвае, што з кожным годам узровень падрыхтоўкі абітурыентаў зніжаецца, асабліва ў выпускнікоў сельскіх школ.

Якія ж пытанні выклікаюць найбольшую цяжкасць пры адказах на ўступных экзаменах? У якіх раздзелах школьнага курсу геаграфіі горш за ўсё арыентуюцца выпускнікі сярэдняй школы? Па-першае, многія дрэнна ведаюць асноўныя паняцці і фармуліроўкі, не ўмеюць даваць звязаную, паслядоўную характарыстыку элементаў прыроднага асяроддзя, не могуць паказаць асноўныя ўзаемасувязі паміж імі. Па-другое, не могуць даць дастаткова матываваную гаспадарчую ацэнку прыродным умовам і паказаць сувязі, існуючыя паміж прыроднай сферай і гаспадарчай дзейнасцю грамадства. Па-трэцяе, вельмі дрэнна абітурыенты ведаюць асноўныя прынцыпы размяшчэння вытворчасці і фактары, якія вызначаюць развіццё асобных галін на той ці іншай тэрыторыі. Па-чацвёртае, з прыватных пытанняў найбольшую цяжкасць выклікаюць пытанні агульнай цыркуляцыі атмасферы, паняцці аб геаграфічнай абалонцы і прыродных тэрытарыяльных комплексах, агульныя геаграфічныя заканамернасці Зямлі, геалагічная гісторыя нашай планеты, сувязь рэльефу з геалагічнай будовай і тэктонікай тэрыторыі, параўнальная характарыстыка асобных рэгіёнаў і краін, пытанні эканоміка-геаграфічнага раянавання, геаграфіі важнейшых міжгаліновых комплексаў і асобных галін вытворчасці. Вялікую трывогу выклікае тое, што пераважная большасць выпускнікоў школ вельмі дрэнна ведае геаграфічную наменклатуру і зусім не ўмее арыентавацца на розных картах. Складваецца ўражанне, што яны ўвогуле першы раз у жыцці бачаць геаграфічныя карты і нават баяцца да іх падысці /пры падрыхтоўцы адказу на ўступных іспытах дазваляецца карыстацца картамі/. А які ж географ можа быць без ведання карты? І, нарэшце, самае прыкрае -- вельмі дрэнныя веды ў абітурыентаў па геаграфіі сваёй мясцовасці і раёна, вобласці і ў цэлым Рэспублікі Беларусь.

У заключэнне некалькі слоў аб білетах для ўступных іспытаў. Яны складаюцца поўнасцю ў адпаведнасці са школьнай праграмай і "Праграмай для паступаючых у вышэйшыя навучальныя ўстановы Рэспублікі Беларусь" і ўключаюць у сябе два пытанні: адно -па фізічнай геаграфіі, другое -- па эканамічнай. Пры гэтым адно з двух пытанняў абавязкова па геаграфіі Рэспублікі Беларусь.

**Абітурыентам -95**

# АБ ТЫМ, ЯК ПАСПЯХОВА ВЫТРЫМАЦЬ УСТУПНЫЯ ЭКЗАМЕНЫ

## МОВА І ЛІТАРАТУРА

Мова -- душа народа. Добрае веданне і валоданне мовай -- паказчык культуры кожнага чалавека. Па гэтай прычыне абітурыенты ўсіх спецыяльнасцей павінны сур"ёзна аднесціся да экзамену па мове і літаратуры.

Экзамен па мове і літаратуры здаюць абітурыенты, якія паступаюць на ўсе факультэты універсітэта. Абітурыенты, якія паступаюць на філалагічны факультэт, акрамя вуснага экзамену па мове і літаратуры, здаюць экзамен па беларускай мове (дыктант), па рускай мове (дыктант) для спецыяльнасцей адпаведна "беларуская мова і літаратура", "беларуская мова і літаратура з англійскай мовай", "руская мова і літаратура", "руская і беларуская мова і літаратура". Абітурыенты, якія збіраюцца паступаць на спецыяльнасці "руская мова і літаратура з англійскай мовай", пішуць сачыненне па рускай мове і літаратуры.

Дыктант пішацца на працягу 45 хвілін. Пры яго напісанні асаблівую ўвагу трэба звярнуць на літаратурнае вымаўленне, якое часта не супадае з напісаннем. Абітурыенты дапускаюць наступныя арфаграфічныя і пунктуацыйныя памылкі: на правапіс галосных, спалучэнняў галосных у іншамоўных словах, мяккага знака, апострафа, правапіс зычных і іх спалучэнняў, ужыванне вялікай літары. Выпускнікі часта памыляюцца пры напісанні прыставак без- (бяз-), бес- (бяс-), часціцы не-(ня) з самастойнымі часцінамі мовы, прыслоўі, якія пішуцца разам, праз злучок і асобна. Сярод пунктуацыйных памылак сустракаюцца: адсутнасць працяжніка паміж галоўнымі членамі сказа, не адасабляюцца прыдаткі, параўнальныя звароты. Многія абітурыенты не адрозніваюць складаны сказ ад простага з аднароднымі членамі, не ведаюць правілаў адасаблення даданых членаў сказа.

Памылкі абітурыентаў і недахопы іх сачыненняў даволі тыповыя: няўменне даць слушны адказ на адпаведную тэму (адсюль -- або пераказ зместу твораў мастацкай літаратуры, або адказ па схеме), слабае веданне тэкстаў літаратурных твораў, якія вывучаюцца ў школе, няўменне раскрыць тэму сачынення. Даволі часта назіраецца адсутнасць канкрэтнасці ў сачыненнях на так званыя вольныя тэмы. Часцей за ўсё гэта разважанні агульнага плана, нярэдка рытарычныя, у якіх няма сапраўдных ведаў матэрыялу мастацкіх твораў, няма арганізацыі думкі ў пісьмовым выказванні і доказу сваёй пазіцыі. У некаторых выпадках гэта можа быць правільны, але няпоўны адказ на тэму, недастаткова мэтанакіравана выкарыстоўваецца тэкст, робяцца некаторыя фактычныя памылкі. Даволі часта сустракаюцца арфаграфічныя і пунктуацыйныя памылкі.

Кожнаму абітурыенту неабходна ведаць наступныя патрабаванні да сачынення: 1) трэба правільна зразумець пытанне, якое знаходзіцца ў фармуліроўцы тэмы, і даць на яго разгорнуты аргументаваны адказ; 2) паказаць дакладнае веданне тэксту аналізуемага твора і неабходных тэарэтычна-літаратурных паняццяў; 3) уменне аналізаваць не толькі змест, але і мастацкую форму твора; 4) галоўная думка сачынення павінна развівацца па плану (але сам план пісаць неабавязкова). Упрыгожваннем сачынення можа стаць эпіграф. Аднак ён павінен быць дакладным і перадаваць асноўную думку сачынення. У якасці эпіграфа можна выкарыстоўваць вершаваныя радкі выдатных паэтаў, выказванні вядомых пісьменнікаў, дзеячоў мастацтва, філосафаў.

Абітурыент павінен паказаць арфаграфічную і пунктуацыйную пісьменнасць, уменне карыстацца рознымі маўленчымі зваротамі і вобразнымі сродкамі мовы, уменне дакладна і да месца цытаваць, выкарыстоўваць лексіку і фразеалогію роднай мовы. Недапушчальны ў сачыненні агульныя фразы і парушэнні паслядоўнасці пераказу.

Для таго, каб правільна ацаніць сачыненне, экзаменацыйная камісія па мове і літаратуры кіруецца існуючымі школьнымі нормамі ацэнак. Сачыненне пішацца на працягу чатырох астранамічных гадзін. Для многіх абітурыентаў будзе цікава ведаць некаторыя тэмы сачыненняў па рускай мове і літаратуры, якія прапаноўваліся ў апошні час. Сярод іх можна назваць такія тэмы "Я лиру посвятил народу своему" (по поэзии Н.А.Некрасова), "Тема Родины в поэзии С.Есенина", "Почему бессмертен ревизор?", "Поиски смысла жизни передовой дворянской интеллигенции в романе Л.Толстого "Война и мир" і інш.

На вусным экзамене па мове і літаратуры абітурыенту прапаноўваецца білет, які складаецца з трох пытанняў: два з іх тэарэтычныя (адно -- па літаратуры, а другое -- па мове, а трэцяе -- практычнае ( часцей за ўсё граматычны разбор сказа). А для абітурыентаў філалагічнага факультэта прапануецца дадаткова вуснае выказванне. Яго мэта -- выявіць уменне абітурыентаў правільна і прыгожа гаварыць, выказваць свае думкі. Пералік выказванняў змешчаны ў даведніку для паступаючых у ВНУ. Кожны абітурыент атрымлівае спецыяльны экзаменацыйны ліст і рыхтуе адказ на працягу 40 хвілін. Лічыцца абавязковым, каб кожны паступаючы ці падрабязна, ці тэзісна запісаў адказ на кожнае пытанне.

Веданне тэксту канкрэтных літаратурных твораў, уяўленне аб месцы творчасці пісьменніка ў развіцці літаратуры і грамадства, уменне аналізаваць і абагульняць, выразна чытаць і ацэньваць мастацкія творы, валодаць маўленнем, словам -- вось асноўныя якасці вуснага адказу. Акрамя гэтага, вусны адказ, як і сачыненне, павінен быць лагічным, паслядоўным, аргументаваным, дакладным, вобразным і пісьменным. Вусны адказ таксама прадугледжвае чытанне праграмных вершаў на памяць.

Абітурыенты, якія паступаюць на філалагічны факультэт, часцей за ўсё вызначаюць тэму, ідэю мастацкіх твораў, характарызуюць асноўных герояў. Але вызначыць асаблівасці кампазіцыі, стыль твора для многіх даволі цяжка. На вусным экзамене нельга разважаць увогуле аб творы, не ўлічваючы характару пытання ў білеце. У адказах нярэдка назіраецца не толькі адсутнасць ведання тэксту, але і імкненне зрабіць замену канкрэтнага на агульныя фразы і меркаванні.

Паступаючыя павінны добра ведаць сродкі мастацкай вобразнасці і выразнасці, асаблівасці розных жанраў літаратуры, характэрныя рысы лірыкі, прозы і драматургіі як асноўных родаў літаратуры, арыентавацца пры разборы слова па саставу, пры словаўтваральным і фанетычным разборы, марфалагічным і сінтаксічным аналізе сказаў.

Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на веданне не толькі твораў класічнай беларускай і рускай літаратуры (В.Дунін-Марцінкевіч, Ф.Багушэвіч, М.Багдановіч, Я.Купала, Я.Колас, А.Пушкін, Л.Талстой, Ф.Дастаеўскі, А.Чэхаў і інш.), але і сучасных паэтаў і празаікаў (Н.Гілевіч, У.Караткевіч, В.Быкаў, А.Адамовіч, В.Казько і інш.). Аналіз кожнага літаратурнага твора неабходна рабіць зыходзячы з патрабаванняў нашага часу і дасягненняў сучаснай літаратуразнаўчай думкі.

На ўсіх спецыяльнасцях вусны экзамен па беларускай мове і літаратуры ацэньваецца адзнакай. Трэба адзначыць, што пытанні для іншых спецыяльнасцей, безумоўна, не будуць такімі складанымі як для абітурыентаў-філолагаў.

---

Пры паступленні на адпаведныя спецыяльнасці абітурыенты здаюць або два экзамены па матэматыцы (пісьмова і вусна) або адзін (пісьмова або вусна).

Пісьмовы экзамен па матэматыцы праводзіцца ў выглядзе кантрольнай работы. Звычайна абітурыентам прапануюцца два варыянты экзаменацыйнага задання (варыянт для кожнага канкрэтнага абітурыента ўказваецца яму членамі прыёмнай прадметнай камісіі). У кожным з варыянтаў змешчана, як правіла, пяць задач па ўсіх раздзелах школьнага курсу матэматыкі. Сярод задач, якія традыцыйна прапануюцца на пісьмовым экзамене, можна адзначыць наступныя: геаметрычныя (стэрэаметрычныя) задачы; задачы, якія патрабуюць рашэння алгебраічных (трыганаметрычных, лагарыфмічных, паказальных) ураўненняў; задачы, якія патрабуюць рашэння сістэм ураўненняў або няроўнасцей; задачы на знаходжанне мінімальнага (максімальнага) значэння. Калі для канкрэтнай спецыяльнасці не прадугледжаны уступны экзамен па матэматыцы (вусна), то ў варыянты заданняў па пісьмоваму экзамену могуць быць уключаны тэарэтычныя пытанні.

Пісьмовая работа ацэньваецца па чатырохбальнай сістэме. Адзнака "пяць" ставіцца за работу, у якой без памылак выкананы ўсе заданні. Іншыя станоўчыя адзнакі абітурыент атрымлівае за адпаведную колькасць правільна і поўна рошаных задач. Адзнака "два" ставіцца, калі колькасць памылак пераўзыходзіць норму, пры якой можа быць выстаўлена станоўчая адзнака.

## МАТЭМАТЫКА

На экзамене абітурыент атрымлівае тытульны ліст і ліст-укладыш (чарнавік і чыставік). Чарнавыя рашэнні задач запісваюцца ў чарнавік, затым рашэнні пераносяцца ў чыставік. Задача лічыцца рошанай, калі ў чыставіку прыведзена яе поўнае правільнае рашэнне з адказам. Калі на перанос рашэння з чарнавіка ў чыставік не хапае часу, то трэба ўказаць, што рашэнне задачы знаходзіцца ў чарнавіку. У гэтым выпадку прадметная камісія разглядае рашэнне данага задання, запісанага ў чарнавіку.

На экзамен не дазваляецца прыносіць мікракалькулятары, кнігі, даведнікі, табліцы, а таксама чыстыя лісты паперы. Пісаць і чарціць трэба толькі ручкай з сінімі чарніламі або шарыкавай ручкай з сіняй пастай.

Для рашэння задач абітурыенту прадастаўляецца чатыры астранамічныя гадзіны.

Аналіз экзаменацыйных работ мінулых гадоў паказвае, што найбольшую колькасць памылак абітурыенты дапускаюць пры рашэнні стэрэаметрычных задач (няўменне будаваць чарцёж, неабгрунтаванасць пабудоў і вывадаў), пры пераўтварэнні трыганаметрычных, лагарыфмічных і паказальных выражэнняў. Многія памылкі абумоўлены таксама няўменнем адкінуць лішнія рашэнні і выбраць правільны адказ.

Пры правядзенні вуснага экзамену па матэматыцы абітурыенту прапануецца выбраць білет, у якім змешчаны два тэарэтычныя пытанні (па алгебры і геаметрыі) і задача. Прапануемыя пытанні (як і звесткі, неабходныя для рашэння задач пісьмовага экзамену) не выходзяць за межы школьнай праграмы па матэматыцы. Гэтыя пытанні можна знайсці ў даведніку для паступаючых у вышэйшыя навучальныя ўстановы рэспублікі.

Абітурыентам выдаюцца лісты-укладышы, у якіх яны павінны запісаць адказы на тэарэтычныя пытанні і прывесці рашэнне задачы. Гэтыя лісты затым могуць быць выкарыстаны пры разгледжанні заяў абітурыентаў на апеляцыйнай камісіі.

Крытэрыі выстаўлення адзнак на вусным экзамене аналагічныя прымяняемым на пісьмовым экзамене.

Аналіз правядзення вуснага экзамену па матэматыцы паказвае, што найбольш часта сустракаюцца наступныя памылкі: абітурыенты блытаюць азначэнні і ўласцівасці тых або іншых паняццяў, не праяўляюць дакладнасці пры азначэнні асноўных функцый і пабудовы іх графікаў, выяўляюць поўнае неразуменне паняцця модуля.

---

## ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

Сёлета ўступныя экзамены па гісторыі Беларусі для абітурыентаў уяўляюць пэўныя цяжкасці, нягледзячы на тое, што школы і вучні ў апошнія гады атрымалі больш грунтоўныя вучэбныя дапаможнікі. Сярод іх можна назваць такія, як "Гісторыя Беларусі", "Вучэбны дапаможнік для 10-11 класаў сярэдняй школы", "Гісторыя Беларусі. Пытанні і адказы", "Гісторыя Беларусі. Вучэбны дапаможнік для 9 класаў сярэдняй школы" і інш.

У 1993 г. і 1994 г. на старонках часопісаў і газет было апублікавана шмат гістарычных першакрыніц, змястоўных і цікавых артыкулаў, нарысаў, даведачнага матэрыялу па розных перыядах гісторыі. Асабліва трэба адзначыць тое вялікае значэнне, якое мае для вывучэння гісторыі нашай рэспублікі "Беларускі гістарычны часопіс", на старонках якога змяшчаецца разнастайны навуковы і навукова-метадычны матэрыял. Але ўсё ж, нягледзячы на гэтыя станоўчыя зрухі ў падыходзе да вывучэння гісторыі Беларусі, прадметная камісія добра ўяўляе тыя аб"ектыўныя цяжкасці, з якімі сутыкаюцца выпускнікі школ пры падрыхтоўцы да ўступных экзаменаў.

Экзамен па гісторыі Беларусі даволі складаны з-за вялікага аб'ёму матэрыялу. Калі прааналізаваць вынікі ўступных экзаменаў па ім у мінулым годзе, дык можна зрабіць такі вывад: устойлівыя веды па гэтаму прадмету паказвалі толькі асобныя абітурыенты. Улічваючы гэта, прыёмная камісія жадае аказаць у нейкай меры дапамогу абітурыентам пры падрыхтоўцы да ўступных экзаменаў. Прапануем пералік некаторых праблем з тым, каб з'арыентаваць абітурыентаў на ўсведамленне імі найбольш істотных асаблівасцей гістарычнага працэсу Беларусі. У першую чаргу гэта, як і ў папярэднія гады, шэраг праблем, звязаных з узнікненнем і развіццём дзяржаўнасці беларускага народа. Абітурыентам неабходна звярнуць асаблівую ўвагу на сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё Полацкага, Тураўскага і іншых княстваў у перыяд утварэння раннефеадальнай дзяржаўнасці на Беларусі, утварэння Вялікага княства Літоўскага і інш.

Аналізуючы адказы абітурыентаў на ўступных экзаменах па гісторыі Беларусі ў мінулыя гады, неабходна адзначыць таксама крайне агульныя веды па праблемах развіцця культуры Беларусі. Таму на дасканальнае вывучэнне гэтых пытанняў абітурыентам патрэбна звярнуць асаблівую ўвагу. Тое ж датычыцца і спецыфікі сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі дакастрычніцкага перыяду, у асаблівасці праблем, звязаных з правядзеннем рэформы 1861 года, грамадска-палітычным рухам другой паловы 19 стагоддзя / паўстанне 1863г., рух народнікаў, выступленне сялян і рабочых і інш./, фарміраваннем нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа і г.д.

Улічваючы, што сёлета будзе адзначацца 50-годдзе Перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі, абітурыентам неабходна дакладна ўяўляць характар і мэты вайны на аснове навейшых публікацый па гэтай праблеме, умець даць аб'ектыўную ацэнку ваеннай барацьбе супраць акупантаў, ролі і значэнню ў гэтай барацьбе прадстаўнікоў іншых краін і народаў.

# АБ ТЫМ, ЯК ПАСПЯХОВА ВЫТРЫМАЦЬ УСТУПНЫЯ ЭКЗАМЕНЫ

*Абітурыентам -95*

## ЗАМЕЖНАЯ МОВА

Уступны экзамен па замежнай мове будуць здаваць абітурыенты, якія выбяруць для сябе спецыяльнасці: "Правазнаўства", "Гісторыя з правам выкладання англійскай і нямецкай моў", "Геаграфія з правам выкладання англійскай і нямецкай моў", "Руская мова і літаратура з правам выкладання англійскай мовы", "Беларуская мова і літаратура з правам выкладання англійскай мовы", "Гісторыя", "Геаграфія".

Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на спецыялізацыі, якія даюць права выкладання англійскай і нямецкай моў. Будучыя спецыялісты, вам давядзецца жыць і працаваць ва ўмовах рыначнай эканомікі! Магчыма, дзякуючы спецыялізацыі ў замежнай мове, якую можаце атрымаць разам з асноўнай спецыяльнасцю, вы знойдзеце сабе больш дастойную і выгадную сферу прымянення ў народнай гаспадарцы. А можа атрымацца і так, што гэтая другая спецыялізацыя стане для кагосьці першай і асноўнай! Ужо ў наш час мы сутыкаемся з усё ўзрастаючай патрэбай у спецыялістах, якія валодаюць замежнай мовай.

У працэсе чытання экзаменацыйнага тэксту і вуснай размовы выкладчыкі правераць вашы веды правілаў чытання і асноў граматыкі, валоданне лексічным мінімумам і навыкі вымаўлення.

Паступаючым будуць прапанаваны адапціраваныя тэксты з мастацкай і навукова-папулярнай літаратуры, пабудаваныя на тыповых фразах і граматычным матэрыяле школьнага мінімуму. Колькасць незнаёмых слоў не будзе перавышаць 6-8%. Пры перакладзе дазваляецца карыстацца слоўнікам. Разуменне прачытанага правяраецца выбарачным перакладам, шляхам адказу на пытанні экзаменатараў і самастойнай пастаноўкай пытанняў у пісьмовай форме.

Адно з пытанняў білета прадугледжвае размову паміж абітурыентам і экзаменатарамі ў межах вусных тэм, азначаных праграмай сярэдняй школы. У гэтым годзе на экзамен выносяцца наступныя тэмы:

*1. Аб сабе і сваёй сям'і.*
*2. Мой сябар (сяброўка).*
*3. Мая кватэра (дом).*
*4. Мая школа.*
*5. Мой працоўны дзень.*
*6. Мае захапленні. Мой вольны час.*
*7. Мой любімы прадмет.*
*8. Спорт у маім жыцці.*
*9. Мой любімы час года.*
*10. Мае ўражанні ад наведвання кінатэатра, выставы, канцэрта.*
*11. Мой любімы пісьменнік.*
*12. Мая будучая прафесія.*
*13. Мой родны горад (вёска).*
*14. Рэспубліка, у якой я жыву.*
*15. Мінск -- сталіца Рэспублікі Беларусь.*
*16. Выдатныя людзі Беларусі.*
*17. Праблемы экалогіі.*
*18. Геаграфічнае становішча краіны вывучаемай мовы.*
*19. Выдатныя мясціны краіны вывучаемай мовы.*
*20. Што я ведаю аб краіне вывучаемай мовы.*

Абітурыенты павінны разумець замежную мову ў непасрэднай гутарцы і ў фаназапісе. Разуменне мовы на слых будзе праверана праз заданні да аўдытыўнага тэксту. Працягласць гучання такога тэксту -- да 2 хвілін. Яны маюць фабулу і змяшчаюць да 4% нявывучаных слоў, даступных для разумення на аснове здагадкі, пры даўжыні фраз да 10 слоў.

Прадугледжаны таксама спецыяльныя заданні, якія правяраюць веды лексіка-граматычнага матэрыялу.

Выкладчыкі нямецкай мовы прапа[…]нуюць звярнуць увагу на дакладнасць вымаўлення складаных слоў, якіх у нямецкай мове шмат. Трэба бачыць межы паміж кампанентамі складаных слоў, што будзе сведчыць аб разуменні значэння слова ў цэлым.

На экзамене па англійскай мове часцей робяць памылкі ва ўжыванні і перакладзе часовых форм дзеяслова, дрэнна распазнаюць і разумеюць формы герундзія прыслоўя і складана дапаўнення з інфінітывам. Не звяртаюць увагу на прадуктыўныя афіксы англійскай мовы, блытаюць часціны мовы слоў, утвораных ад вядомых каранёў.

---

## ХІМІЯ

Кожны білет па хіміі змяшчае чатыры заданні: адно -- па агульнай і неарганічнай хіміі, другое -- па арганічнай хіміі, у якасці трэцяга задання прапануюцца розныя колькасныя задачы, чацвёртае заданне змяшчае ланцужкі хімічных пераўтварэнняў.

Адказы на пытанні павінны быць па магчымасці поўнымі і ў абавязковым парадку суправаджацца напісаннем адпаведных хімічных формулаў і ўраўненняў рэакцый.

На ўступных экзаменах паступаючы ва універсітэт павінен паказаць веданне агульных тэарэтычных палажэнняў хіміі як адной з асноўных прыродазнаўчых навук; умець прымяняць іх пры разглядзе асобных класаў рэчываў і канкрэтных злучэнняў; ведаць уласцівасці важнейшых рэчываў, якія прымяняюцца ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы, быце; разумець навуковыя прынцыпы важнейшых хімічных вытворчасцей (не заглыбляючыся ў дэталі хімічнай тэхналогіі), рашаць тыповыя нескладаныя задачы. На экзамене не можна карыстацца табліцамі: "Перыядычная сістэма хімічных элементаў Мендзялеева", "Растваральнасць асноў, кіслот і соляў у вадзе", "Электрахімічны рад напружанняў металаў".

Прывядзем найбольш характэрныя памылкі, якія дапускаюць многія абітурыенты на ўступным экзамене па хіміі. Многія з іх не ўмеюць правільна пісаць эмпірычныя і структурныя формулы злучэнняў і ўраўненні прасцейшых хімічных рэакцый. Не ўсе ясна ўяўляюць, што такое ступень акіслення, як вызначыць яе велічыню зыходзячы з формулы злучэння, атаясамліваюць ступень акіслення і валентнасць элемента. Нярэдка дапускаюцца памылкі пры напісанні поўных ураўненняў рэакцый, ураўненняў ступеньчатай дысацыяцыі кіслот і асноў.

Значная колькасць абітурыентаў слаба ўяўляе сутнасць акісляльна-аднаўленчых рэакцый, асаблівасці ўзаемадзеяння сернай і азотнай кіслот з металамі, памылкова лічаць, што ў рэакцыях азотнай кіслаты з металамі ўтвараюцца солі азотнай кіслаты і вадарод.

Пры тлумачэнні хімічных уласцівасцей арганічных рэчываў часта спасылаюцца пераважна на класічную тэорыю фізічнай будовы і прымяняюць малекулярныя формулы, вельмі рэдка выкарыстоўваючы пры адказах электронныя ўяўленні і структурныя формулы злучэнняў. Не заўсёды здавальняюча тлумачыцца ўзаемнае ўздзеянне атамаў у малекулах арганічных злучэнняў.

Не ўсе абітурыенты могуць растлумачыць залежнасць уласцівасцей розных арганічных злучэнняў ад наяўнасці характэрных функцыянальных груп.

Агульны сур'ёзны недахоп большасці абітурыентаў на экзамене па хіміі -- адсутнасць практычных навыкаў, а іншы раз і поўная бездапаможнасць у рашэнні разліковых задач.

---

## ПА СПЕЦЫЯЛЬНАЙ ФІЗІЧНАЙ ПАДРЫХТОЎЦЫ

Зыходным палажэннем экзаменаў па плаванню і спецыяльнай фізічнай падрыхтоўцы з"яўляецца вызначэнне ўзроўню агульнафізічнай падрыхтаванасці і рухальнага апарату абітурыентаў.

У гэтым годзе, як і ў папярэднім, для абітурыентаў, паступаючых на факультэт фізічнай культуры на дзённай форме навучання, прадугледжаны прыём на 2 аддзяленні -- агульнае і спартыўнае.

Спартыўнае аддзяленне ўключае віды спорту на падставе школьнай праграмы і шматгадовых спартыўных традыцый універсітэта: лёгкая атлетыка, веславанне на байдарках і каноэ, гімнастыка, барацьба, спартыўныя гульні, плаванне.

Абітурыенты, паступаючыя на спартыўнае аддзяленне, да пачатку экзаменаў па плаванню і спецыяльнай фізічнай падрыхтоўцы праходзяць субяседаванне, дзе да іх прад"яўляюцца больш высокія патрабаванні ў тэарэтычнай падрыхтаванасці і ўзроўню спартыўнай кваліфікацыі ў пэўным відзе спорту.

Здача экзаменаў пачынаецца з іспытаў па плаванню і пры паспяховай здачы абітурыенты працягваюць здаваць іншыя экзамены. Экзамен па спецыяльнай фізічнай падрыхтоўцы ўключае нарматывы і патрабаванні спартыўнага шматбор"я, у якім прадугледжана выкананне чатырох абавязковых відаў фізічных практыкаванняў у адпаведнасці з існуючымі правіламі спаборніцтваў.

Вынік кожнага віду фізічных практыкаванняў ацэньваецца ў заліковых балах /гл.табліцу/. У табліцы таксама паказаны нарматывы і патрабаванні па плаванню. Дыстанцыю можна праплыць адным з трох прыведзеных стыляў.

Неабходна адзначыць, што выкананне любога спартыўнага нарматыву чатырохбор"я ніжэй заліковага ацэньваецца двума /"2"/ баламі, якія не з"яўляюцца заліковымі і не ўваходзяць у агульную суму бальнай адзнакі за экзамен.

Такім чынам, адзнака па спецыяльнай фізічнай падрыхтоўцы складаецца з сумы вынікаў толькі заліковых балаў, набраных абітурыентам у спартыўным шматбор"і:

ад 18 да 20 балаў -- 5 /выдатна/;
ад 14 да 17 балаў -- 4 /добра/;
ад 10 да 13 балаў -- 3 /здавальняюча/.

Абітурыенты-медалісты пры паспяховай здачы экзамену па плаванню і экзамену па спецыяльнай фізічнай падрыхтоўцы з адзнакай "5" вызваляюцца ад здачы астатніх экзаменаў.

Абітурыентам неабходна звярнуць асаблівую ўвагу на плаванне. Так, аналіз вынікаў мінулых гадоў паказвае, што абітурыенты ў асноўным выбіраюць вольны стыль і, такім чынам, не заўсёды паказваюць свае здольнасці ў вывучаных імі стылях плавання. Таму выдзяленне экзамену па плаванню зроблена з мэтай павышэння як агульнага ўзроўню падрыхтаванасці па гэтай дысцыпліне,. так і вызначэння эфектыўных спосабаў і стыляў плавання абітурыентамі.

Найбольшыя цяжкасці ў авалодванні нарматывамі і патрабаваннямі па спецыяльнай фізічнай падрыхтоўцы адчуваюць абітурыенты, якія дрэнна валодаюць асноўнымі фізічнымі якасцямі -- сілай, хуткасцю, вынослівасцю, спрытнасцю. Гэта ў першую чаргу нарматывы па бегу на 1000 м, кіданню гранаты, гімнастычных практыкаваннях. У сувязі з гэтым нагадаем, што ў школьнай праграме /XI клас/ задачы па ўдасканаленню фізічных якасцей прадугледжваюць развіццё сілы тулава, хуткасна-сілавых якасцей, сілы рук, сілавой вынослівасці і г.д. Акрамя таго, фізічны стан не абмяжоўваецца толькі названымі фізічнымі якасцямі. Фізічнае развіццё і ўзровень працаздольнасці арганізма, яго аднаўляльнасць пасля нагрузкі -- гэта не менш важна для абітурыента. Паспяхова засвойваць вучэбную праграму на факультэце фізічнай культуры могуць, як правіла, тыя студэнты, якія маюць добры фізічны стан, рознабаковую фізічную падрыхтоўку, тэарэтычныя веды і патрэбу ў сістэматычных занятках фізічнымі практыкаваннямі.

Табліца

| Экзамены | Узрост | Нарматыўныя патрабаванні і заліковыя балы | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | мужчыны | | | жанчыны | | |
| СПЕЦФІЗПАДРЫХТОЎКА | | 5 | 4 | 3 | 5 | 4 | 3 |
| Лёгкая атлетыка: | | | | | | | |
| 1. Бег 100м /сек/ | 17-29 | 12.6 | 13.1 | 13.6 | 14.5 | 15.5 | 16.5 |
| | 30 і болей | 13.0 | 13.5 | 14.0 | 15.0 | 16.0 | 17.0 |
| 2. Бег 1000м /мін,сек./ | 17-29 | 3.05 | 3.10 | 3.16 | 3.52 | 4.10 | 4.30 |
| | 30 і болей | 3.15 | 3.25 | 3.35 | 4.10 | 4.30 | 5.00 |
| 3. Кіданне гранаты /м/ | 17-29 | 48.0 | 44.0 | 38.0 | 32.0 | 27.0 | 22.0 |
| | 30 і болей | 45.0 | 41.0 | 35.0 | 27.0 | 22.0 | 18.0 |
| Гімнастыка: мужчыны — падцягванне ў вісе на перакладзіне хватам зверху | 17-29 | 15 | 12 | 8 | - | - | - |
| | 30 і болей | 12 | 9 | 6 | - | - | - |
| жанчыны — згібанне і разгібанне рук ва ўпоры лежачы /згібанне рук не менш 90⁰, колькасць разоў/ | 17-29 | - | - | - | 28 | 22 | 14 |
| | 30 і болей | - | - | - | 22 | 18 | 11 |
| Плаванне 100м /мін, сек/ вольны стыль | 17-29 | 1.32 | 1.47 | 2.02 | 1.38 | 1.53 | 2.08 |
| | 30 і болей | 1.42 | 1.57 | 2.12 | 1.48 | 2.03 | 2.18 |
| брас | 17-29 | 1.45 | 2.00 | 2.15 | 2.03 | 2.18 | 2.33 |
| | 30 і болей | 1.55 | 2.10 | 2.25 | 2.13 | 2.28 | 2.43 |
| кроль на спіне | 17-29 | 1.45 | 2.00 | 2.15 | 1.53 | 2.08 | 2.23 |
| | 30 і болей | 1.55 | 2.10 | 2.25 | 2.03 | 2.18 | 2.33 |

---

## БІЯЛОГІЯ

Уступны экзамен па біялогіі ў вуснай форме ў адпаведнасці з правіламі прыёму будуць здаваць абітурыенты, паступаючыя на біялагічны факультэт і факультэт фізічнай культуры і спорту.

На ўступных экзаменах па біялогіі абітурыенты павінны паказаць глыбокія і грунтоўныя веды агульных асноў біялогіі, ведаць фактычны матэрыял у аб"ёме праграмы сярэдняй школы, мясцовую флору і фауну і яе біялагічныя асаблівасці.

Экзамен па біялогіі для стацыянарнай і завочнай форм навучання ўключае раздзелы батанікі, заалогіі, анатоміі, фізіялогіі і гігіены чалавека, агульнай біялогіі і складаецца з трох тэарэтычных пытанняў. У білеты ўключаюцца два пытанні з агульнай біялогіі і трэцяе з раздзелаў анатоміі, або фізіялогіі і гігіены чалавека.

Як сведчыць здача ўступных экзаменаў у папярэднія гады, абітурыенты даюць больш грунтоўныя адказы на пытанні па батаніцы, заалогіі, анатоміі, фізіялогіі і гігіене чалавека, там дзе значны апісальны матэрыял. Аднак горш яны асвятляюць пытанні па агульнай біялогіі, недастаткова ведаюць мясцовы жывёльны і раслінны свет, распаўсюджанне жывёл і раслін па розных экалагічных зонах.

Неабходна адзначыць, што часта адказы абітурыентаў неканкрэтныя, яны не могуць звязаць тэарэтычныя веды з практыкай і прывесці прыклады з сельскагаспадарчай і прамысловай вытворчасці. Недастаткова абітурыенты арыентуюцца ў экалагічных пытаннях, слаба ведаюць віды жывёл і раслін, якія занесены ў Чырвоную кнігу. У значнай ступені гэтыя заўвагі адносяцца да абітурыентаў, паступаючых на факультэт фізічнай культуры і спорту.

Цэлы шэраг абітурыентаў не могуць правільна і паслядоўна даць адказ на пастаўленае пытанне нават у тым выпадку, калі ведаюць фактычны матэрыял, паказваюць недастатковыя веды па анатоміі, фізіялогіі і гігіене чалавека, асабліва па такіх раздзелах, як "Абмен рэчываў", "Нярвовая сістэма", "Кроў" і інш.

СПОРТ

# ЛЁГКААТЛЕТЫ РАДУЮЦЬ

Лёгкая атлетыка — каралева спорту, уключае ў сябе больш 40 відаў, сярод якіх можна выдзеліць так званую "групу вынослівасці" з дыяпазонам бегавых дысцыплін ад сярэдніх дыстанцый да звышдоўгіх.

Аўтару гэтых радкоў разам з трэнерам абласной ШВСМ С.М.Сураўцавым на працягу апошніх трох гадоў удалося стварыць на факультэце фізічнай культуры баяздольны калектыў. На сённяшні дзень гэта адна з мацнейшых груп у Рэспубліцы Беларусь. Па выніках мінулага спаборніцкага сезона мы маем пераможцаў і прызёраў дарослых чэмпіянатаў і Кубкаў, маладзёжных гульняў і юніёрскіх першынстваў. У праграме Студэнцкіх гульняў толькі першымі рабяты былі 15 разоў, не ўлічваючы прызавых месцаў, і ўнеслі самы важкі ўклад у агульную скарбонку ачкоў нашага універсітэта, які па выніках мінулага года заняў другое агульнакаманднае месца сярод ВНУ Рэспублікі Беларусь.

Паспяховымі былі і выступленні на міжнароднай арэне. Так, м/с студэнтка 3 курса Алена Бычкоўская выйшла пераможцай цэлай серыі стартаў у Польшчы і Чэхіі. Вянцом сезона было яе выступленне на чэмпіянаце Еўропы ў г.Хельсінкі. Ледзьледзь не дацягнуўшы да фінальнага забегу, яна тым не менш сярод нямногіх членаў беларускай каманды ўстанавіла асабісты рэкорд у галоўным старце сезона — бегу на 1500 м -- 4.12,65. Студэнт 2 курса м/с Анатоль Буткоўскі выйшаў пераможцам паўфіналу Кубка Еўропы ў бегу на 800 м у Тэль-Авіве і закончыў сезон з вынікам 1.47,2. Студэнт 4 курса Уладзімір Сівалобаў, які паправіўся пасля цяжкай траўмы толькі пад канец сезона, перамог на прэстыжным прабегу "Маларыта", пераадолеўшы 20 км з рэкордным часам 1:01.19,2. Студэнт 2 курса Аляксандр Цітоў двойчы перамог на Маладзёжных гульнях РБ як у бегу на 800, так і 400м. Яго поспех падтрымаў студэнт 1 курса Дзмітрый Шкалёў, які на гэтых дыстанцыях быў другім. Студэнт 2 курса Сяргей Цішкоў узначаліў спіс мацнейшых юніёраў Беларусі ў бегу на 3000 і 5000 м.

На вышэйшай ноце рабяты пачалі і новы спаборніцкі сезон. А.Бычкоўская стала чэмпіёнкай зімовага чэмпіянату Рэспублікі Беларусь ў бегу на 800 м -- /2.09,67/ і 1500 м /4.22,60/, а А.Буткоўскі двойчы на 800 /1.50,23/ і 1500м /3.44,4/. Анатоль кідаў пальчатку больш вядомым і тытулаваным беларускім алімпійцам А.Судніку, А.Макарэвічу і А.Ракіпаву і абодва разы браў верх, за што атрымаў спецыяльны прыз лепшага лёгкаатлета Беларусі. Другім пераадолеў 400 м /49,1/ А.Цітоў. У непасрэднай блізкасці ад п"едэсталу ў бегу на 3000 м /8.25,0/ быў і С.Цішкоў, які ўпершыню спаборнічаў у кампаніі дарослых спартсменаў.

Важкі ўклад у перамогу каманды ГДУ па лёгкай атлетыцы на зімовым чэмпіянаце сярод ВНУ ў г.Мінску ўнеслі нашыя рабяты, якія заваявалі 7 залатых, 3 сярэбраныя і 1 бронзавы жэтоны.

І вось новы поспех! На адкрытым чэмпіянаце Расіі па лёгкай атлетыцы , які праходзіў у г.Валгаградзе, А.Буткоўскі перамог у бегу на 1500 м /3.46,2/ і ўсяго адну дзесятую секунды ўступіў пераможцу ў бегу на 800 м /1.50,23/, заняўшы другое месца. На добрым узроўні тут выступіла і А.Бычкоўская. У мацнейшай кампаніі расійскіх спартсменаў, пераможцаў і прызёраў алімпійскіх гульняў, чэмпіянатаў свету і Еўропы, яна прабілася ў фінал і заняла ганаровае чацвёртае месца ў бегу на 1500 м /4.21,0/ і пятае на 800 м /2.05,2/.

Напярэдадзе цяжкі і адказны летні сезон, шэраг буйных міжнародных стартаў, сярод якіх і Сусветныя студэнцкія гульні ў Японіі. Рабяты гатовыя аддаць сілы барацьбе і дастойна прадставіць наш універсітэт на міжнароднай арэне.

Аднак, не магу на аптымістычнай ноце закончыць агляд матэрыял. У нас усіх застаўся горкі прысмак ад даклада дырэктара спартклуба ГДУ па выніках работы за 1994 год, дзе акрамя некалькіх добрых слоў у наш адрас яшчэ і адзначана, што ўсе пераможцы і прызёры ўдастоены грашовых прызоў. Відаць, гэта той выпадак, калі абяцанага тры гады чакаюць.

**Г.НАРСКІН,**
**кандыдат педагагічных навук, дацэнт.**

КОНКУРСЫ

# ТРОЕ АДВАЖНЫХ

Культурны цэнтр ГДУ вырашыў прадоўжыць добрую традыцыю правядзення сярод выкладчыкаў і супрацоўнікаў конкурсу на лепшае прыгатаванне страў. На гэты раз ён быў прысвечаны святу 8 Сакавіка і да ўдзелу ў ім запрашаліся выключна мужчыны. Рызыкнулі паказаць свае кулінарныя таленты толькі... тры прадстаўнікі моцнай паловы чалавецтва.

Дацэнт кафедры эканамічных тэорый Б.У.Сарвіраў прадставіў на суд журы тры віды тартоў і пячэнне, выкладчык кафедры фізвыхавання С.Б.Пірагоў -- торт і кіраўнік харавой капэлы "Дзянніца" М.А.Казлоў -- лікёр. Журы аднадушна вырашыла аддаць Гран-пры першаму з названых удзельнікаў, астатнія адпаведна на 2 і 3-м месцах. Адвага кулінараў па заслугах ацэнена: яны атрымалі адразу па некалькі каштоўных прызоў.

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ**

аб"яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

-- англійскай мовы -- выкладчыка;
-- дыферэнцыйных ураўненняў -- заг.кафедры;
-- рускай мовы для замежных навучэнцаў -- ст.выкладчыка.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699 г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў кафедры філасофіі выказваюць глыбокае спачуванне дацэнту **НЯДЗЕЛЯ** Ларысе Іванаўне з выпадку напаткаўшага яе гора -- смерці **МАЦІ**.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат біялагічнага факультэта, калектыў кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлін выказваюць глыбокае спачуванне загадчыку кафедры **КАРПЕНКУ** Аляксею Фёдаравічу з выпадку напаткаўшага яго гора -- смерці **БРАТА**.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Рэгістрацыйны № 221

Спонсары газеты -- НВП "Сучасныя тэхналогіі", прафком студэнтаў.

Газета набрана і зверстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на Гомельскай фабрыцы "Палесдрук", г.Гомель, вул.Савецкая, 1.

Рэдактар
Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.500 экз.
Заказ 151
Падпісана да друку 17.03.95.